# Ветлівыя звароты беларусаў: ад станаўлення сістэмы да выкарыстання ў Інтэрнэце



Аўтар: вучаніца 10 «А» класа
ДУА «СШ №6 г. Мінска»
Фалько Анастасія



***Нішто не абыходзіцца нам так танна і цэніцца так дорага, як ветлівасць.***

***Сервантэс***

# Якія ветлівыя словы вы ведаеце? Адказваюць вучні 9-х класаў



# Мэта:

вывучэнне слоў і зваротаў ветлівасці, мадэляў моўнага этыкету беларусаў і карыстанне імі ў сеціве Інтэрнэту.

# Задачы:

* Вывучыць спрадвечныя мадэлі моўнага этыкету беларусаў.
* Звярнуць увагу на ўжыванне гэтых мадэляў у сучаснай беларускай мове і беларускім сеціве Інтэрнэту.
* Сістэматызаваць уласнабеларускія словы і звароты ветлівасці і скласці даведнік па іх выкарыстанні.

Этыкет *(франц. étiquette)* – сукупнасць правіл паводзін, што разглядаюцца як знешнія праявы адносін да людзей.

Моўны этыкет – сістэма патрабаванняў, якія тлумачаць нам, якім чынам варта ўсталёўваць, падтрымліваць і перарываць кантакт з іншым чалавекам у пэўнай сітуацыі.

Мадэлі маўленчага этыкету – гэта пэўныя словы, фразы і ўстойлівыя выразы, якія прымяняюцца падчас гутаркі.

# Дзеля бліжняга азначэння ўжываліся наступныя канструкцыі:

**Васіль Міхневіч** (*бацька*)

*нежанаты сын*

**Пётра Васілёнак Міхневіч**

*жанаты сын*

**Пётра Васілёнак Міхневічык (Міхнеўчык)**

*незамужняя дачка*

**Ганна Васілянка Міхневічанка**

*замужняя дачка*

паводле прозвішча яе мужа (напр. Апанасовіча): **Ганна Васілянка Апанасовічыха**


Прозвішчы:
Васілёнак,
Міхалёнак
У імёнах па бацьку:
-онак, -ёнак; -анок, -янок; -анка, -янка; -ышка, -ішка
Васілёнак, Міхалёнак,
Антанёнак, Васілянка
суфіксы
Абазначалі прыналежнасць:
-оў, -ёў; -ін, -ын
Пётра – Васілёў сын
Настасся – Кузьміна дачка
Прозвішчы:
Васільеў, Кузьмін

# Адпаведнасць прозвішча жонкі ці дачкі прозвішчу мужа ці бацькі ў сучаснай літоўскай мове

Adomaitis (Адамовіч) – бацька

Adomaitiene (Адамовічыха / Адамовічава) – жонка

Adomaityte (Адамавічанка) - дачка

# Ветлівыя звароты

спадарства, спадары *(руск. господа)* – царская Расія

таварыш *(руск. товарищ)* – часы існавання СССР

## Зараз:

спадар Андрусь

спадарыня Арына *(замужняя жанчына)*

спадарыч Алесь *(нежанаты хлопец)*

спадарычня Паўлінка *(незамужняя дзяўчына)*

спадарства *(вялікая аўдыторыя або сямейная пара)*

Спадару! *(клічная форма, на пісьме ўжываецца заўсёды з клічнікам)*

# Скарочаныя формы афіцыйных ветлівых зваротаў да асобы

спадар – ***Сп.*** (Сп. дырэктар, Сп.Вішнеўскі)

спадарыня – ***Спн.***(Спн. Вішнеўская)

спадарыч – ***Спч.*** (Спч. Вішнеўскі)

спадарычня – ***Спчн.*** (Спчн. Вішнеўская)

спадарства – ***Спв.*** (Спв. Андруся і Арыны)

# Ветлівыя звароты

| | |
|---|---|
| ~~Ты~~ | Сам |
| ~~Вы~~ | Ваша + дзеяслоў у форме адз. ліку |
| ~~Тата кажа~~ | Тата кажуць (3 ас. мн. л.). |
| ~~Мамо казала~~ | Мамо казалі(3 ас. мн. л.). |

# Этыкетныя формулы беларускай мовы

*паводле сітуацыі ўжывання*

* Вітанні
* Развітанні
* Падзякі
* Прабачэнні
* Зычэнні
* Адрасаванні

# Тэндэнцыі выкарыстання ветлівых зваротаў ў Інтэрнэце

1. Вяртанне этыкетных формул, што выкарыстоўваліся ў перапісцы беларускай інтэлігенцыі пачатку XX ст.

*Спадарства! Шаноўнае спадарства! Паважанае спадарства! (35 зваротаў з 72)*

2. Моцнае праяўляенне народнай словатворчасці.

*Шанавенства! Браты й сёстры грамацеі-пісьменцы! Спадары фрэнды! Шаноўныя бульбазаўры! Спадарасы! Прывітанне, мае любыя шкаляры!*
*Алё! Лінгвісты і перакладчыкі!*

3. Адсутнасць ветлівых зваротаў.


Научить и воспитать...
Мы сможем!
ВЫХОД


Ламака Н. Д., Фалько А. В.
ВЕТЛІВЫЯ СЛОВЫ
па-беларуску
Даведнік


Вітанні /приветствия/
З пажаданнем здароўя
Здароў! Здарова! Здаравенькі. Здароўця!
З пазначэннем часу сустрэчы
Добрага дня! Добры вечар! Добры ранак!
Працоўныя
Памагай Бог! Спору ў працы! Спешна вам.
Пры ўваходзе ў хату
Добры дзень у хату! Здароў вам у вашу хату
Адрасаваныя людзям у час яды Якія выказваюць павагу да адрасата
Смачна есці! Сыць вам, людзі! Чалом вам! Чалом кланяюся!
Пытанні
Як жывіцё? Як маешся? Як жа вы там? Жывяце?
Афіцыйныя або ўрачыстыя
Вітаю Вас! Дазвольце Вас прывітаць.
Размоўныя
Здарова! Салют! Прывітанне!
Развітанні /прощания/
Пры жаданні новай сустрэчы
Да пабачэння! Да пабачэннейка!
Пры развітанні назаўжды
Бывай(це)! Бывай здароў (здаровенькі) / здарова (здаровенька)!
У любой сітуацыі
Будзь(ма)!
Сказаць штосьці на адыходак
Дабранач! (уначы) Пакуль! Жадаю (Зычу) усяго найлепшага!
Калі хтосьці адыходзіць першым, дык ён скажа:
Заставайся здароў / здаровенька! (скарочана: Заставайся!)
А той, хто застаецца, на адыходак пажадае:
Ідзі здароў / здаровенька! З Богам!
Калі чалавек выпраўляецца ў дарогу
Асвяці, Божа!

# Дзякуй за ўвагу!